**ACTA ALBARUTHENICA 25: 2025**
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Victor Khalipov, 2025
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne
4.0 PL (CC BY-NC 4.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.25.12

**Віктар Халіпаў ♦ Victor Khalipov**

Клайпедскі ўніверсітэт, Літва
Klaipeda University, Lithuania
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-0328-7716
e-mail: victor.khalipov@gmail.com

# Рамантызацыя і экзатызацыя вобраза літоўца ў творах У. Караткевіча, А. Куляшова і А. Якімовіча пра паўстанне 1863–1864 гадоў

*Romanticization and Exoticization of the Image of a Lithuanian in the Works of U. Karatkevich, A. Kulashou and A. Yakimovich about the Uprising of 1863–1864*
*Romantyzacja i egzotyzacja obrazu Litwina w utworach U. Karatkiewicza, A. Kulaszoua i A. Jakimowicza o powstaniu 1863–1864*

**ABSTRACT**: In U. Karatkevich's works about the 1863–1864 uprising, the image of the Lithuanian acquires new features previously uncharacteristic of Belarusian literature – he is romanticized and exoticized. As a hetero-image, the Lithuanian contrasts with the auto-image of the Belarusian not as 'bad', 'evil' or 'wrong', but as 'strange', 'unusual' and 'unaccustomed.' His social status also changes: now he is often associated with the heroic figures of Catholic priests. This new tradition is continued by some other authors of the second half of the 20th century, such as A. Kulashou and A. Yakimovich.

**KEYWORDS**: ethnotype of a Lithuanian, imagology, exoticisation, Catholic priest, Belarusian literature.

У творах беларускай літаратуры, прысвечаных паўстанню 1863–1864 гадоў, цэнтральнае месца займаюць вобразы саміх беларусаў. Аднак важную ролю ў некаторых з іх адыгрываюць і персанажы, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі іншых народаў, што актыўна бралі ўдзел у апісаных падзеях. Некаторыя з такіх вобразаў маюць рэальных гістарычных прататыпаў, аднак нават яны нярэдка выяўляюць рысы этнічных стэрэатыпаў, характэрных для беларускай літаратурнай традыцыі –

не кажучы ўжо пра персанажаў, якія цалкам з'яўляюцца плёнам мастацкай выдумкі пісьменніка. Пры гэтым тэксты, створаныя праз шмат гадоў пасля апісаных падзей, часткова праецыруюць на сваіх этнічна маркіраваных персанажаў уяўленні, якія склаліся ўжо ў сучаснай беларускай культуры.

Вобраз літоўца ў творах беларускіх аўтараў пра паўстанне 1863–1864 гадоў амаль не вывучаны, ды і ў цэлым асаблівасці мастацкага ўвасаблення гэтага этнатыпу ў нацыянальнай літаратурнай традыцыі даследаваліся досыць мала – у адрозненне, напрыклад, ад этнатыпу паляка. Ёсць працы, прысвечаныя вобразу літоўца ў традыцыйным беларускім фальклоры [Лобач, Внуковіч 2011] альбо часткова датычныя гэтай тэмы [Мечковская 2002; Внуковіч 2010]. Некаторыя важныя і цікавыя высновы адносна літоўскіх рэалій у публіцыстыцы нашаніўскага часу робіць Віктар Корбут [2023]. Сярод нешматлікіх навуковых праектаў, якія ў нейкай ступені закранаюць уяўленні аб літоўцах у аўтарскай мастацкай літаратуры, можна назваць імагалагічныя даследаванні Наталлі Бахановіч [2018, 2023], аднак яна звяртаецца толькі да прыгожага пісьменства Беларусі XIX стагоддзя і ў асноўным аналізуе вобразы саміх беларусаў; меркаванні пра ўспрыманне літоўцаў у беларускай культуры ёсць ва Уладзіміра Тапарова [1990], пра вобраз літоўцаў у беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя піша Анжэла Мельнікава [2016], аднак усё гэта толькі дастаткова кароткія назіранні, зробленыя ў больш шырокім супастаўляльным кантэксце. У той жа час аўтару гэтага артыкула невядомы філалагічныя працы, якія былі б спецыяльна цалкам прысвечаны дадзенай праблематыцы[1].

Метадалогія гэтай працы – імагалогія ў яе нідэрландска-нямецкім варыянце, не вельмі характэрная для даследаванняў этнічна маркіраваных вобразаў беларускай літаратуры, асабліва ў плане трактоўкі сістэм нацыянальных стэрэатыпаў як *мадэрных* з'яў, у тым ліку з пазіцый канструктывізму. Імагалагічныя тэрміны, якія маюць featuresрознае тлумачэнне, даюцца ў трактоўцы Юпа Лейрсена [2007, 2016, 2022]. Адпаведна, пад тэрмінам *этнатып* разумеецца этнічны стэрэатып, якому нададзена літаратурная форма, мастацкі вобраз. Часта (але не заўсёды) ён уяўляе сабой спрошчаны, клішаваны тыпаж, мастацкі складнік якога зводзіцца толькі да пазнавальнасці. З сукупнасці этнатыпаў (вобразаў персанажаў асобных твораў) складаецца *імагатып* – абагульнены сукупны вобраз

[1] Напрыклад, у фундаментальнай манаграфіі *Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія*, створанай Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, даследуюцца вобразы беларусаў, палякаў, украінцаў, рускіх, нават іспанцаў і брытанцаў у беларускай літаратуры, – аднак літоўцы абыдзены ўвагай [Гніламёдаў, Мікуліч (рэд.) 2022].

аднаго народа (або краіны) у літаратуры і культуры іншага народа. У сваю чаргу, з наратываў, якія аперыруюць імагатыпамі ў якасці катэгорый, складаецца нацыянальная *імагаміфалогія* [Meltzer 2001], якая спрабуе асэнсаваць і апісаць нацыю або народ праз супастаўленне з іншымі нацыямі і народамі. У гэтай школе імагалогіі лічыцца, што мастацкая літаратура не толькі фіксуе і рэтранслюе нацыянальную імагаміфалогію, але і актыўна фармуе яе.  У дачыненні да тэмы дадзенага даследавання гэта азначае, што некаторыя аўтары не толькі выкарыстоўваюць пры стварэнні мастацкіх вобразаў элементы ўжо існуючых этнічных стэрэатыпаў, але і дадаюць ім новыя рысы, не характэрныя для прадстаўнікоў гэтых народаў у папярэдняй літаратурнай традыцыі – у сваю чаргу, у далейшым некаторыя з такіх рыс выкарыстоўваюцца і іншымі пісьменнікамі, што садзейнічае іх распаўсюджванню ўжо ў якасці стэрэатыпных.

Галоўны аб’ект даследавання ў дадзеным артыкуле – трагедыя *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць* (1963)[2] Уладзіміра Караткевіча, чыя творчасць не толькі вельмі моцна паўплывала на шляхі развіцця беларускай літаратуры, але і прывяла да некаторых змен у найноўшай беларускай ідэнтычнасці[3]. Яго ўздзеянне на нацыянальную імагаміфалогію пераважна адчувальнае ў плане развіцця аўтавобраза саміх беларусаў, аднак закранае і гетэравобразы іншых народаў, актуальныя для беларускай культурнай прасторы. Адным з такіх з’яўляецца этнатып літоўца, які ў цэлым у творах беларускіх аўтараў прадстаўлены не вельмі шырока.

Важны персанаж трагедыі У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць* –  Бронюс Марцявічус, вобраз якога дазваляе выявіць некаторыя рысы, якія меркавана маюць дачыненне да імагатыпа літоўца ў беларускай літаратурнай традыцыі ў цэлым. Вобраз гэты вельмі незвычайны і з’яўляецца адным з самых яскравых у творы; ён займае асаблівую пазіцыю ў сістэме дзейных асоб п’есы, сярод якіх, акрамя беларусаў, ёсць палякі, рускія, немцы і француженка.

Усе персанажы трагедыі падзелены У. Караткевічам на групы ў залежнасці ад іх стаўлення да паўстання і ролі ў ім. Марцявічус аднесены пісьменнікам да *сейбітаў* – гэта ідэйныя натхняльнікі і кіраўнікі

---

2 Гэтая п’еса не толькі паспяхова ставілася ў тэатрах і на радыё, але нават стала асновай беларускага комікса па яе матывах [Сінькова 2015: 156-157].

3 “У той час, калі У. Караткевіч прыходзіць у літаратуру, у беларускай традыцыі моцна ўкараніўся «сялянскі» варыянт нацыянальнага міфа, які арганічна ўпісваўся ў ідэалагічную дактрыну савецкай дзяржавы. Пісьменнік паслядоўна разбурае стэрэатыпы ўспрыняцця беларускай нацыі выключна як сялянскай і стварае цэлы шэраг твораў, якія мы схільныя вызначаць як нацыятворчыя <...>” [Бутырчык, Казлоўская 2016: 10].

паўстання, яго актыўныя ўдзельнікі, пераважна шляхта[4]. У спісе дзейных асоб п'есы ён пазначаны як *кінжальшчык*. Кінжальшчыкі – гэта ўзброеная арганізацыя дыверсійна-тэрарыстычнай накіраванасці, якая актыўна дзейнічала ў 1863–1864 гадах на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі. У іх функцыі, апроч іншых, уваходзіла выкананне смяротных прысудаў здраднікам, шпіёнам, а таксама іншым асобам, па рашэнню судоў паўстанцаў. Такім чынам, У. Караткевіч робіць Бронюса Марцявічуса не проста адным з інсургентаў, а прадстаўніком найбольш радыкальнай з падпольных структур паўстання.

Гэта выключны герой у выключных абставінах, вобраз якога вытрыманы ў эстэтыцы неарамантызму. Упершыню мы знаёмімся з ім у сцэне на канспіратыўнай кватэры ў Вільні; як і належыць у падполлі, ён называе сакрэтны пароль і распавядае іншым інсургентам пра сваю місію. Перад намі паўстае таямнічая, змрочная і трагічная постаць, якая вяшчае глухім голасам з-пад каптура, а часам і зусім пераходзіць на шэпт. Калі ён нечакана ўступае ў гутарку, гэта палохае некаторых з прысутных дам, бо, як тлумачыць сам У. Караткевіч у сваёй аўтарскай рэмарцы, "чалавек – страшны" [Караткевіч 1990: 26]. "Змрочны, маўклівы і доўгі, як Мефістофель" [Караткевіч 1990: 37], – апісвае яго аўтар у іншай сцэне. Па ходзе развіцця дзеяння Марцявічус не раз параўноўваецца з Мефістофелем, а эмацыйная напружанасць гэтага вобраза акцэнтуецца аўтарам рэмаркамі тыпу "на яго страшна глядзець".

Высвятляецца, што Бронюс прыбыў у Вільню з Усходняй Беларусі, з Магілёўшчыны, дзе паўстанне было жорстка задушана царскімі войскамі, разам з іншым інсургентам, шляхціцам Вітаўтам Парафіяновічам, які і распавядае пра гэтыя трагічныя падзеі прысутным. Сам Марцявічус вызначае сваю місію так: "Я прыйшоў з ім, каб паслухаць, як ён раскажа аб усім" [Караткевіч 1990: 29], але гэта зусім не пасіўны слухач, ён кантралюе дакладнасць інфармацыі і актыўна ўмешваецца ў ход размовы, карэктуючы і дапаўняючы звесткі.

Бронюс паводзіць сябе вельмі незалежна і ганарліва ў адносінах да іншых персанажаў, якія прысутнічаюць у гэтай сцэне, – не гледзячы на тое, што гэта ў асноўным беларускія і польскія шляхціцы, а сам ён, як высвятляецца, – незаконнанароджаны сын ксяндза. "Я тое, што людзі завуць «байструком»" [Караткевіч 1990: 29], – з уласцівай яму змрочнай іроніяй гаворыць ён пра сябе. Аднак падобнае "маргінальнае" паходжанне таксама служыць ва У. Караткевіча адным са спосабаў стварэння вакол дадзенага персанажа арэолу незвычайнасці і выключнасці, яго экзатызацыі ў традыцыях эстэтыкі неарамантызму.

---

[4] Таксама і алегарычны вобраз самой Беларусі.

Сам бацька Бронюса Марцявічуса, ксёндз Малявічус, не з’яўляецца ў п’есе непасрэдна ў якасці персанажа, яго вобраз складаецца з прысвечаных яму рэплік сына. Гэта каталіцкі святар з правінцыйнага мястэчка, які блаславіў мясцовых сялян на паўстанне, а пасля быў павешаны за гэта падчас расправы з яго ўдзельнікамі. Дадзены вобраз, хоць і слаба канкрэтызаваны, таксама, безумоўна, акружаны рамантычным арэолам. “У бога быў сын, а чаму мне нельга? ” [Караткевіч 1990: 29], – вальнадумна тлумачыў ён з’яўленне ў яго дзіцяці. Паводле даследаванняў Алеся Макарэвіча, пятнаццаць персанажаў п’есы маюць рэальных гістарычных прататыпаў [Макарэвіч 2022: 108–109] – з вялікай доляй верагоднасці гэта таксама адносіцца і да ксяндза Малявічуса. Можна меркаваць, што гэта літоўскі святар Антанас Мацкявічус (1828–1863), адзін з правадыроў паўстання, які пасля адмовы выдаць паплечнікаў быў павешаны Мураўёвым [Ilgūnas 2007].

Постаць Антанаса Мацкявічуса з’яўляецца прэцэдэнтнай для беларускай літаратурнай традыцыі – так, напрыклад, у Аркадзя Куляшова мы бачым яго сярод дзейных асоб драматычнай паэмы *Хамуціус* (1975), дзе ён выступае ўжо непасрэдна пад сваім сапраўдным прозвішчам [Куляшоў 2003]. Вобразу літоўца тут прысвойваюцца некаторыя характарыстыкі, падобныя да тых, што мы бачым ва У. Караткевіча, а сама паэма ў цэлым выяўляе пэўную пераемнасць з трагедыяй *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць*, напісанай дванаццаццю гадамі раней[5].

У паэме А. Куляшова дзеянне часткова адбываецца ў Вільні і лакалізуецца ў касцёле, дзе праходзяць сустрэчы кіраўнікоў інсургентаў. Антанас Мацкявічус прыбывае сюды з Панявежы з важнай інфармацыяй пра падтрымку паўстання замежнымі дзяржавамі. Аднак ён паўстае перад намі не проста як свайго роду сувязны, які паспяхова ажыццяўляе канспіратыўную камунікацыю дзякуючы карпаратыўнай салідарнасці каталіцкага кліру. Гэта адзін з правадыроў паўстання, які застаецца маральным і духоўным аўтарытэтам для паплечнікаў нават пасля сваёй смерці. Цікава, што ў А. Куляшова Мацкявічус звяртаецца да Каліноўскага “Костас, браце“ [Куляшоў 2003: 229], выкарыстоўваючы літоўскую форму яго імя. Зварот *Kostas* сугучны беларускаму *Кастусь*, у творы героя так называюць толькі яго каханая і блізкія паплечнікі.

Антанас Мацкявічус апісваецца як прыхільнік рэвалюцыйных метадаў барацьбы, арыентаваны на сялянства:

[5] Таксама даследчыкі адзначаюць, што гэтая паэма была створана А. Куляшовым у нейкай меры пад уплывам трылогіі *Mindaugas, Katedra, Mažvydas* Юстынаса Марцінкявічуса (1930-2011) [Харошка 2006: 113].

[...] Каб міліён талераў
Я меў, то, божы занядбаўшы сан,
Наймаў бы генералаў, каб сялян
Вучылі за мяжой на афіцэраў... [Куляшоў 2003: 283]

Пры гэтым у А. Куляшова і Кастусь Каліноўскі, і Антанас Мацкявічус – гэта вернікі, што (як і сам факт вывядзення практыкуючага каталіцкага святара ў якасці станоўчага героя) для беларускай літаратуры савецкага часу з’яўляецца не вельмі характэрным. У паэме згадваюцца і некаторыя іншыя вядомыя клірыкі Літвы, якія адкрыта ці таемна падтрымалі паўстанне. Гэта “біскуп <...> у Ворні”[6] [Куляшоў 2003: 229] – маецца на ўвазе Матэйус Валанчус (1801–1875), біскуп Жамойціі, выбітны літоўскі пісьменнік, гісторык і асветнік. Ва ўмовах забароны царскімі ўладамі кнігадрукавання на літоўскай мове ён быў адным з арганізатараў нелегальнага распаўсюджвання літоўскіх кніг, выдадзеных ва Усходняй Прусіі [Žemaitytė-Narkevičienė 2000]; некаторы час ён служыў капеланам у горадзе Мазыры на тэрыторыі Беларусі. Таксама гэта “ксёндз Ішора” [Куляшоў 2003: 282] – Станіслаў Ішора (1838–1863), вікарый жалудкоўскай парафіі[7]. Ён зачытаў у касцёле маніфест з заклікам да паўстання, а затым непасрэдна далучыўся да атрада Людвіка Нарбута [Jackiewicz 2024: 101–102]; публічна расстраляны ў 1863 г. – гэта было першым выкананнем смяротнага прысуду ваенна-палявых судоў Мураўёва [Нікольскі, Дудкоў, Лочмель (рэд.) 1940, 2: 522–523].

У якасці персанажа Антанас Мацкявічус дзейнічае і ў аповесці Алеся Якімовіча *Кастусь Каліноўскі* (1971). Гэты твор таксама развівае рамантызаваную традыцыю вобраза паўстання і яго ўдзельнікаў, выяўляючы ў той жа час рысы паэтыкі сацыялістычнага рэалізму. Тут ксёндз Мацкявічус паўстае перад намі як камандзір аднаго з атрадаў паўстанцаў, які непасрэдна ўдзельнічае ў баявых дзеяннях з царскімі войскамі. Яго статус як святара рэдукаваны, акцэнт у стварэнні вобраза пераносіцца на трактоўку персанажа як бясстрашнага змагара за вызваленне ад царызму, якога пасля яго смерці проста няма кім замяніць [Якімовіч 1978: 404, 408].

Важна, што Антанас Мацкявічус у А. Якімовіча – менавіта *літоўскі* патрыёт (у той час як у адносінах да некаторых іншых персанажаў кантэкст твора часта не дазваляе зрабіць адназначнай высновы аб тым, кім лічыць іх аўтар – палякамі, літоўцамі ці беларусамі). У тэксце шмат разоў акцэнтуецца, што Мацкявічус – “малады літоўскі ксёндз з гарачым

---

[6] літ. *Varniai* – горад у Цяльшыйскім павеце Літвы; да 1864 г. тут знаходзіўся цэнтр епархіі.
[7] Жалудок – цяпер гарадскі пасёлак у Гродзенскай вобласці Беларусі.

сэрцам і вольнымі думкамі” [Якімовіч 1978: 299], “думаў і клапаціўся толькі пра сваіх прыхаджан – літоўскіх сялян” [Якімовіч 1978: 299], “сабраў свой атрад з адных літоўскіх мужыкоў” [Якімовіч 1978: 357][8]. Такім чынам, Мацкявічус у А. Якімовіча паказаны не толькі як свайго роду рэвалюцыянер, змагар з царызмам, але і як фігура, якая мае дачыненне менавіта да “літоўскага сялянскага патрыятызму”, вылучаючыся ў гэтым плане сярод іншых правадыроў паўстання. У аповесці згадваюцца і іншыя каталіцкія святары, у тым ліку і ўдзельнікі таемнай вызваленчай арганізацыі – напрыклад, ксёндз Гінтаўт – аднак мы не можам дакладна меркаваць аб тым, лічыць кагосьці з іх аўтар літоўцамі ці не[9].

У гэтым кантэксце заслугоўвае ўвагі вось які факт. У першай рэдакцыі п’есы У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць* персанаж-літовец мае прозвішча Ябланаўскас [Гарноўская 2010: 28], у пазнейшай рэдакцыі яно было заменена аўтарам на Марцявічус – больш падобнае да прозвішча магчымага прататыпа бацькі героя. У сваю чаргу, прататыпам Ябланаўскаса ў першым варыянце п’есы, відаць, таксама быў рэальны ўдзельнік паўстання – літоўскі клірык Валянцінас Яблаюўскіс, арыштаваны 11 мая 1863 года [Katilius 2009: 103]. Вось што піша пра гэта Альгімантас Кацілюс: “Aktyviai sukilime dalyvavo vienintelio Vilniaus vyskupuos Rasnos marijonų vienuolyno vienuoliai. Kaltinimai buvo pateikti penkiems šio vienuolyno vienuoliams: (...) Bresto parapijos vikarui Valentinui Jablonovskiui”[10] [Katilius 2007: 105]. Расна цяпер – аграгарадок у Брэсцкай вобласці Беларусі, размешчаныя там марыянскі манастыр і касцёл былі зачыненыя ў 1868 г. у пакаранне за ўдзел манахаў і мясцовых жыхароў у паўстанні. Аднак у Беларусі ёсць і яшчэ адна Расна, у мінулым цэнтр аднайменнага ваяводства, цяпер – вёска ў Магілёўскай вобласці

[8] Вызначэнне *літоўскі* выкарыстоўваецца А. Якімовічам менавіта ў якасці этнанімічнага, а не хоранімічнага, яно выразна супрацьпастаўлена ў гэтым плане вызначэнню *беларускі*.

[9] Пры гэтым у аповесці А. Якімовіча парадаксальным чынам прысутнічаюць і антыкаталіцкія выпады, якія, аднак, накіраваныя ўжо супраць *польскіх* святароў, напрыклад: “Не меншая роспач ахапіла і самых шчырых служак рымска-каталіцкага касцёла – польскіх ксяндзоў. Стагоддзямі яны па загаду рымскіх папаў ірваліся на ўсход услед за легіёнамі польскіх каралёў і магнатаў. Крывавым мечам і святым крыжам акаталічвалі і апалячвалі літоўцаў, беларусаў, украінцаў” [Якімовіч 1978: 316]. Гэта адзін з вядомых наратываў літаратуры беларускага сацыялістычнага рэалізму, на станаўленне якога моцна паўплываў антыпольскі дыскурс савецкай прапаганды 1920–1930-х гадоў, у тым ліку і ў плане фармавання адпаведных этнічных стэрэатыпаў.

[10] “Актыўна ўдзельнічалі ў паўстанні манахі Расненскага марыянскага манастыра, адзінага ў Віленскім біскупстве. Абвінавачанні прад’яўлены пяцярым манахам гэтага манастыра: <...> Валянцінасу Ябланоўскісу, вікарыю Брэсцкай парафіі” (*літ.*). Пераклад з літоўскай аўтара артыкула.

Беларусі, якраз прыкладна там, адкуль у п’есе У. Караткевіча персанаж Бронюс Марцявічус прыязджае да паплечнікаў з навінамі аб разгроме. У 1863 годзе гэты населены пункт быў ненадоўга заняты інсургентамі, якія спалілі архівы царскай паліцыі.

Магчыма, увесь гэты комплекс культурных асацыяцый паўплываў на У. Караткевіча падчас працы над трагедыяй. У любым выпадку відавочны намер пісьменніка ўвязаць вобраз свайго персанажа з фігурамі каталіцкіх святароў-літоўцаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў апісаных гістарычных падзеях[11]; прытрымліваюцца ў гэтым плане такой традыцыі і А. Куляшоў, і А. Якімовіч. Пры гэтым у творах беларускай літаратуры першай паловы XX ст., прысвечаных падзеям 1863–1864 гг., мы не бачым не толькі вобраза Антанаса Мацкявічуса і іншых літоўскіх святароў – але і ўвогуле якіх-небудзь літоўцаў, гэты этнатып тут не сустракаецца. Маюцца на ўвазе п’еса *Кастусь Каліноўскі* (1923) Еўсцігнея Міровіча [1957: 3–68], апавяданне *Палёт у мінулае. Ад Каліноўскага да нашых дзён* (1924) Андрэя Александровіча [1924: 33–52], паэмы *Кастусь Каліноўскі* (1926) Анатоля Вольнага [1926: 3–20] і *Сьмерць Кастуся Каліноўскага* (1934) Міхася Машары [1934], лібрэта *Кастусь Каліноўскі* (1944) Міхася Клімковіча [1959, 2: 24–52].

У другой палове XX стагоддзя імагатып літоўца не толькі актуалізуецца для беларускай літаратуры, але і эвалюцыянуе ў плане характарыстык, звязаных з саслоўна-сацыяльным статусам персанажаў. У рэалістычных творах пачатку XX стагоддзя, напрыклад, у Максіма Гарэцкага, таксама часам ёсць вобразы клірыкаў-літоўцаў, аднак дамінуючымі тут з’яўляюцца этнатып літоўца-сяляніна і стэрэатыпны вобраз Літвы як сельскай краіны, блізкі ў гэтым плане вобразу Беларусі. Акрамя таго, у М. Гарэцкага святары-літоўцы – гэта нязначныя другарадныя персанажы, якія не адыгрываюць істотнай ролі ў падзеях, пасіўныя, часам

[11] У п’есе апісваецца і рознае стаўленне да паўстання прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій: калі каталіцкае духавенства падтрымлівае яго, то праваслаўнае – актыўна супрацьдзейнічае: “Поп казаў у нядзелю, што, маўляў, гэта паны, што прыгон вярнуць хочуць. Цар вызваліў, дык яны паўставаць. З амбона казаў – не брэша” [Караткевіч 1990: 9]. Гэтая сітуацыя была яшчэ больш ускладненая прымусовым пераводам уніятаў у праваслаўе, які адбыўся раней, – у тым ліку і варварскімі гвалтоўнымі метадамі. Вось што піша з гэтай нагоды, напрыклад, рускі пісьменнік Аляксандр Герцэн у сваім нарысе *Гродненская история* (1858): “<...> полицейский <...> сёк людей до тех пор, пока человек не соглашался принять причастие от православного попа” (“<...> паліцэйскі <...> сёк людзей датуль, пакуль чалавек не згаджаўся прыняць прычасце ад праваслаўнага папа”) [Герцен 1958, 13: 390]. Іншымі словамі, з’яўленне элементаў, звязаных з канфесіянальнай праблематыкай, у творах беларускай літаратуры, прысвечаных паўстанню 1863–1864 гг., з’яўляецца далёка не выпадковым.

сентыментальныя, але ніяк не гераізаваныя і не рамантызаваныя. У плане саслоўна-сацыяльнага статусу стэрэатыпы беларускай традыцыі транслююць уяўленні аб тым, што літоўцы-сучаснікі XIX–XX стст. – гэта сяляне, або святары, зрэдку рабочыя і інтэлігенты, сярод іх няма абшарнікаў, магнатаў ды і проста заможных людзей.

У. Караткевіч часткова прытрымліваецца гэтай традыцыі, аднак у значнай меры развівае і змяняе яе. Літовец Бронюс Марцявічус у яго – гэта не шляхціц, не дваранін, але і зусім не прасталюдзін. Нягледзячы на свой суровы і трагічны вобраз, гэта галантны кавалер, які ўмее паводзіць сабе з дамамі ў адпаведнасці з правіламі этыкету, чалавек, які ўпэўнена адчувае сабе і сярод беларускай і польскай шляхты, і ў асяроддзі рускіх дваран на балі ў губернатара, якія ўспрымаюць яго як аднаго са сваіх (пры гэтым ён удзельнічае там у выкраданні царскага палкоўніка, пасля пакаранага ім жа).

У вобразе Бронюса Марцявічуса непахісная воля, бязлітаснасць да ворагаў і апантанасць асабістай помстай спалучаюцца з прыродным тактам, далікатнасцю ў адносінах да паплечнікаў. Гэты змрочны кінжальшчык – не бяздумны выканаўца загадаў кіраўнікоў паўстання, ён выдатна ўсведамляе, што і для чаго робіць, а яго ўчынкі дыктуюцца хутчэй асабістым выбарам, уласнымі ўяўленнямі аб справядлівасці і пакаранні, прыхільнасцю пэўным ідэям, якія падзяляюцца і іншымі інсургентамі. У пэўнай ступені Марцявічус сам з’яўляецца ініцыятарам падзей, якія складаюць адну з важных сюжэтных ліній твора.

Пры ўсёй яго адданасці ідэалам паўстання Бронюс – і не фанатык, яму ўласцівы рэфлексія і ў цэлым філасофска-сентыментальны погляд на жыццё, што становіцца больш зразумела толькі ў канцы п’есы, калі ён паступова прывыкае да сваіх новых паплечнікаў-беларусаў і раскрываецца і з гэтага свайго боку. Паказальная ў гэтым плане, напрыклад, сцэна апошняй размовы Марцявічуса з Бабаедам і Каліноўскім перад самым арыштам Кастуся. Яна нясе ў сістэме дзеяння важную сэнсавую нагрузку, вытрымана ў падкрэслена рамантычнай эстэтыцы і носіць сімвалічны характар.

Дзеянне адбываецца ў Вільні, поўнай царскіх жандараў і вайскоўцаў, якія паўсюль шукаюць інсургентаў. Каліноўскі і яго паплечнікі пакідаюць небяспечную канспіратыўную кватэру і хаваюцца ў знакавым для гісторыі Літвы і Беларусі месцы – Свентаянскіх мурах, пустым будынку абсерваторыі закрытага царскімі ўладамі Віленскага ўніверсітэта, ужо сама абстаноўка якой кантрастуе са штодзённай паўсядзённай рэчаіснасцю як дзіўнае, незвычайнае і таямнічае месца (старадаўнія нябесныя сферы, секстант, знакі знакаў задыяка, тэлескопы, адзін з якіх накіраваны скрозь прыадчыненыя створкі купала ў зорнае неба).

Не менш незвычайнымі з’яўляюцца і рэплікі героя, якія ў гэтай сцэне па сутнасці не паўстаюць дыялагічным сродкам камунікацыі з іншымі персанажамі, а паступова складваюцца ў нейкае падабенства фрагментаванага філасофскага маналогу, прасякнутага рамантычным і нават сентыментальным пафасам. У пустых залах абсерваторыі, якая не працуе пасля пажару, Бронюс адчувае сябе нібы ў пустыні, быццам усе людзі на зямлі памерлі, і ён адзіны жывы. Ён глядзіць на зорнае неба, успрымаючы яго як цуд, які рэзка кантрастуе з недасканаласцю навакольнай рэчаіснасці: “Чорт ведае чым людзі займаюцца: стрэлы, шыбеніцы, подласць. А тут... такое дзіва...” [Караткевіч 1990: 74].

Нягледзячы на небяспеку, Бронюс гаворыць натхнёна і ўзнёсла, адчуваючы сябе сам-насам з небам: “Што людзі будучага перад намі? Нікога не здзівіць чалавек сярод людзей. А вось чалавек сярод ваўкоў, свіней, гіен – вось што варта здзіўлення. А нараджаецца, жыве чалавекам сярод поскудзі. Значыць, ад прыроды – харошы... А я раней не бачыў неба... як многія...” [Караткевіч 1990: 76]. У гэтай філасофскай сцэне пад купалам абсерваторыі ўзнёслыя рамантычныя рэплікі Марцявічуса аказваюцца шмат у чым сугучнымі рэплікам галоўнага героя п’есы – Каліноўскага. Невыпадкова трэці ўдзельнік гэтай незвычайнай гутаркі – беларускі селянін Бабаед – кажа пра іх абодвух так: “Гэта вы... паэты... Са зброяй спіцё... Без жонак, без дзяцей, без грошай. Так, за народнае дзякуй” [Караткевіч 1990: 75].

Надзелены аўтарам літоўскім імем і прозвішчам, Бронюс Марцявічус і ў спісе дзеючых асоб, і ў аўтарскіх рэмарках, і ў рэпліках персанажаў вызначаецца як *жмудзін*. У беларускай літаратурнай традыцыі такое бывае, калі аўтару важна падкрэсліць, што гэта прадстаўнік балцкага, а не славянскага насельніцтва, а такая намінацыя зусім не абавязкова мае на ўвазе жамойта ў вузкім сэнсе, а можа быць назвай літоўцаў-балтаў у цэлым. Пры ўсёй ідэйнай блізкасці галоўных герояў трагедыі на працягу ўсёй п’есы аўтар выразна супрацьпастаўляе Бронюса менавіта як літоўца персанажам-беларусам.

Вобраз літоўца ў творчасці У. Караткевіча – гэта не заўсёды персанаж, які па-сяброўску ставіцца да беларусаў. Так, напрыклад, у рамане *Каласы пад сярпом тваім* (1965) мы сутыкаемся з Альгердам Корвідам, які паўстае тут як адзін з антаганістаў галоўнага героя, Алеся Загорскага. І сам аўтар-апавядальнік, і яго персанаж падкрэслена акцэнтуюць, што Альгерд – гэта менавіта літовец. “<...> я не разумею, якія адносіны да Польшчы мае немец Фан дэр Фліт, рускі Воранаў, літовец Корвід” [Караткевіч 1981: 330] – іранічна заўважае герой У. Караткевіча.

Сярод інтэрнацыянальнай па сваім складзе групы праціўнікаў Алеся Загорскага літовец Альгерд Корвід вылучаецца як асабліва небяспечны

супернік, які ў адрозненне ад астатніх валодае нейкімі таемнымі прыёмамі рукапашнага бою. Адным непрыкметным ударам ён можа "кінуць чалавека ў непрытомнасць і вывесці з бойкі на доўгі час" [Караткевіч 1981: 328]. Гэты таямнічы экзатычны навык выдатна ўсведамляецца таварышамі Альгерда, якія выкарыстоўваюць яго менавіта ў якасці свайго асноўнага байца. "Тое, што бойкі не мінуць, ён зразумеў адразу. Іначай на якога д'ябла ім быў патрэбен Корвід?" [Караткевіч 1981: 329].

Альгерд маўклівы, за ўвесь час ён прамаўляе толькі адну кароткую рэпліку: "Ясна, – змрочна сказаў Корвід" [Караткевіч 1981: 331]; нават моцна траўміраваўшы руку, ён не ўскрыквае і не стогне, а *шыпіць*. Незвычайнасць персанажа спалучаецца з апісаннем яго знешнасці, характэрнай для рамантычнага героя: "Прыгожае, жорсткае аблічча Альгерда было абыякавае" [Караткевіч 1981: 328]. Пры гэтым яго адрозненне ад таксама рамантызаванага вобраза галоўнага героя-беларуса ляжыць менавіта ў плоскасці *экзатычнай* эстэтызацыі[12].

У імагалогіі мяркуецца, што аснову мадэлявання *ўяўнага* этнічнага ландшафту ў літаратуры заўсёды складае апазіцыя "ethnocentrism vs. exoticism or xenophobic" [Leerssen 2016: 47]. Мы бачым, што ва У. Караткевіча беларускае, якое разумеецца як нармальнае, нейтральнае, супрацьпастаўляецца літоўскаму – як экзатычнаму, незвычайнаму. Пры гэтым мы не бачым тут этнацэнтрычнага супрацьстаяння *Свайго* як "правільнага", "добрага" – *Чужому* як "няправільнаму", "дрэннаму", "злому", як гэта было б у ксенафобнай парадыгме.

Супастаўленне этнатыпа літоўца ва У. Караткевіча з сучаснымі стэрэатыпнымі ўяўленнямі пра літоўцаў выяўляе дастаткова вялікую колькасць супадзенняў. Так, напрыклад, паводле вынікаў невялікага сацыялагічнага апытання 2009 года [Волынец 2009: 19–20], беларусы адзначылі наступныя рысы нацыянальнага характару, уласцівыя, на іх думку, літоўцам: *спакойныя, працавітыя, незалежныя, асцярожныя, флегматычныя, скрытныя, дзіўныя, суровыя*. Многія з гэтых рысаў можна аднесці і да Бронюса Марцявічуса, і да Альгерда Корвіда, а таксама да вобразаў літоўцаў у А. Куляшова і А. Якімовіча. Персанажы-літоўцы ў беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя, умоўна "да Караткевіча", адпавядаюць гэтым сучасным стэрэатыпным уяўленням у меншай ступені.

---

[12] Яшчэ адным творам У. Караткевіча, які часткова адсылае нас да падзей 1863–1864 гг., з'яўляецца раман *Нельга забыць* (1962). Тут аўтар стварае ўжо вобраз літоўца другой паловы XX стагоддзя, таксама рамантызаваны і экзатызаваны [Караткевіч 1988].

## Высновы

У цэлым вобраз літоўца ў творах У. Караткевіча, А. Куляшова, А. Якімовіча, прысвечаных паўстанню 1863–1864 гг., з пункта гледжання імагалогіі характарызуецца наступнымі важнымі асаблівасцямі:

1. Мае выразную этнічную маркіраванасць, якая маніфестуецца аўтарамі з дапамогай яго літоўскіх імя і прозвішча, аўтарскіх рэмарак і рэплік персанажаў-беларусаў, якія атрыбутуюць яго па нацыянальнай прыкмеце.

2. Як гетэравобраз ён супрацьпастаўлены аўтавобразу беларуса, аднак гэтае супрацьпастаўленне носіць досыць мяккі характар і можа быць асэнсавана не ў катэгорыях архаічнай парадыгмы *Свой / Чужы*, а ў яе мадэрным варыянце *Свой / Іншы*. Адпаведна, тут не адбываецца размежавання па крытэрыях аксіялагічнага характару з прысваеннем этнатыпу разнастайных негатыўных характарыстык, на падставе якіх ён успрымаўся б як непрымальны і варожы (хоць і можа лічыцца патэнцыйна небяспечным). Аддзяленне персанажа ад *Сваіх* пераносіцца ў плоскасць эстэтычнага, што дасягаецца шляхам яго *экзатызацыі*: яму прыпісваюцца якасці, у прынцыпе прымальныя і для беларусаў, але, на іх думку, не вельмі характэрныя для іх саміх. У такой парадыгме літовец адрозніваецца ад беларуса не тым, што ён «злы» ці «дрэнны» (ён такім не лічыцца), а тым, што ён “дзіўны”, “незвычайны”, “нязвыклы”.

3. Некаторыя рысы, якімі У. Караткевіч надзяляе вобразы літоўцаў, карэлююць з адпаведнымі стэрэатыпнымі ўяўленнямі, якія выяўляюцца ў беларускай літаратурнай традыцыі, іншыя – не маюць да гэтага дачынення, а з’яўляюцца элементамі неарамантычнай паэтыкі твораў альбо сродкамі індывідуалізацыі персанажаў, не звязанымі з іх этнічнай прыналежнасцю. Аднак іх не так проста карэктна размежаваць: спецыфікай літаратурнай спадчыны пісьменніка з’яўляецца тое, што ён не толькі акумуляваў у сваёй творчасці ўжо існуючыя элементы беларускай нацыянальнай культурнай традыцыі, але і актыўна твары́ў яе, дапаўняючы новымі. Пераасэнсаваныя пісьменнікам наратывы нацыянальнай культуры пасля часта працягвалі рэтрансляваццa ў яе сістэме менавіта ў рэакцыі, прапанаванай У. Караткевічам. У тым ліку гэта мае дачыненне і да беларускай нацыянальнай імагаміфалогіі. Можна сцвярджаць, што пісьменнік як бы распачаў працэс стварэння новых, умоўна “высокіх” ці “рамантычных”, версій некаторых імагатыпаў, часткова альтэрнатыўных іх ранейшым версіям, характэрным для беларускага рэалізму і сацрэалізму. Рысы персанажаў-літоўцаў ва У. Караткевіча шмат у чым карэлююць са стэрэатыпнымі ўяўленнямі пра літоўцаў у сучаснай беларускай культуры і ў пэўнай ступені адрозніваюцца ад

тых, што былі зафіксаваны ў творах беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя.

4. У сацыяльна-саслоўным плане імагатып літоўца можа ўвязвацца са сферай каталіцкага кліру, пры гэтым самі вобразы літоўцаў-святароў гераізуюцца і рамантызуюцца. Гэтая традыцыя набывае развіццё ў драматычнай паэме А. Куляшова *Хамуціус* і аповесці А. Якімовіча *Кастусь Каліноўскі*.

## References


Aleksandrovič Andrèj. 1924. *Palët u minulae. Ad Kalinoŭskaha da našyx dzën.* “Maladnjak” 5: 33–52 [Александровіч Андрэй. 1924. *Палёт у мінулае. Ад Каліноўскага да нашых дзён.* “Маладняк” 5: 33–52].

Baxanovič Natal'ja, 2018. *Obrazy poljaka i belorusa-litvina v mnogojazyčnoj literature Belarusi XIX stoletija.* „Studia Rossica Gedanensia” 5: 233–250 [Баханович Наталья, 2018. *Образы поляка и белоруса-литвина в многоязычной литературе Беларуси XIX столетия.* „Studia Rossica Gedanensia” 5: 233–250].

Baxanovič Natallja, Varabej Maryna, Trafimčyk Anatolʹ. 2023. *Mastacki vobraz Bacʹkaŭščyny ŭ litaratury Belarusi XIX stahoddzja. Minsk: Belaruskaja navuka* [Бахановіч Наталля, Варабей Марына, Трафімчык Анатоль. 2023. *Мастацкі вобраз Бацькаўшчыны ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя.* Мінск: Беларуская навука].

Butyrčyk Hanna, Kazloŭskaja Maryna. 2016. *“Kalasy pad sjarpom tvaim” Uladzimira Karatkeviča jak alʹtèrnatyŭny varyjant nacyjanalʹnaha mifa.* U: Hanna Butyrčyk (rèd.). *Slavjanskija litaratury ŭ kantèksce susvetnaj: da 750-hoddzja sa dnja naradžènnja Dantè Alih'ery i 85-hoddzja Uladzimira Karatkeviča: matèryjaly XII Mižnar. navuk. kanf., Minsk, 22–24 kastr. 2015 h.* U 2 č. Č. 2. Minsk: RIVŠ. 8–22 [Бутырчык Ганна, Казлоўская Марына. 2016. *“Каласы пад сярпом тваім” Уладзіміра Караткевіча як альтэрнатыўны варыянт нацыянальнага міфа.* У: Ганна Бутырчык (рэд.). *Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 750-годдзя са дня нараджэння Дантэ Аліг'еры і 85-годдзя Уладзіміра Караткевіча: матэрыялы XII Міжнар. навук. канф., Мінск, 22–24 кастр. 2015 г.* У 2 ч. Ч. 2. Мінск: РІВШ. 8–22].

Gercen Aleksandr. 1958. *Grodnenskaja istorija (Semaško, Filaret).* U: Gercen Aleksandr. *Sobranie sočinenij: v 30 tomax.* T. 13. Moskva: Izdatel'stvo Akademii nauk SSSR [Герцен Александр. 1958. *Гродненская история (Семашко, Филарет).* У: Герцен Александр. *Собрание сочинений: в 30 томах.* Т. 13. Москва: Издательство Академии наук СССР. 390–391].

Harnoŭskaja Vera. 2010. *Tèkstalahičnae pračytanne trahedyi U. Karatkeviča “Kastusʹ Kalinoŭski” (varyjanty 1963, 1990 hh.).* U: Ljudmila Sinʹkova (rèd). *Belaruskae litaraturaznaŭstva: navukova-metadyčny zbornik.* Vyp. 8. Minsk: BDU, Parkus pljus. 27–30 [Гарноўская Вера. 2010. *Тэксталагічнае прачытанне трагедыі У. Караткевіча “Кастусь Каліноўскі” (варыянты 1963, 1990 гг.).* У: Людміла Сінькова (рэд). *Беларускае літаратуразнаўства: навукова-метадычны зборнік.* Вып. 8. Мінск: БДУ, Паркус плюс. 27–30].

Hnilamëdaŭ Uladzimir, Mikulič Mikalaj (rèd.). 2022. *Belaruska-eŭrapejskija litaraturnyja ŭzaemasuvjazi i imahalohija.* Minsk: Belaruskaja navuka [Гніламёдаў Уладзімір, Мікуліч Мікалай (рэд.). 2022. *Беларуска-еўрапейскія літаратурныя ўзаемасувязі і імагалогія.* Мінск: Беларуская навука].

Ilgūnas Gediminas. 2007. *Antanas Mackevičius: sukilimo žygiai ir kovos.* Vilnius: Versus Aureus.

Jackiewicz Mieczysław. 2024. *Maria Kiersnowska z Kupryszek – prababką marszałkini Senatu RP.* „Znad Wilii" 3(99): 101–106.

Jakimovič Ales′. 1978. *Kastus′ Kalinoŭski.* U: Ales′ Jakimovič. *Zbor tvoraŭ u 3-x tamax.* T. I. Minsk: Mastackaja litaratura. 189–437 [Якімовіч Алесь. 1978. *Кастусь Каліноўскі.* У: Алесь Якімовіч. *Збор твораў у 3-х тамах.* Т. I. Мінск: Мастацкая літаратура. 189–437].

Katilius Algimantas. 2007. *Marijonų vienuolynai 1863 m. sukilime ir jų uždarymas.* „Lietuvių katalikų mokslo akademijos metraštis" 30: 97–126.

Katilius Algimantas. 2009. *Lietuvos vienuolijų dalyvavimas 1863–1864 m. Sukilime.* „Lietuvių katalikų mokslo akademijos metraštis" 32: 79–112.

Karatkevič Uladzimir. 1981. *Kalasy pad sjarpom tvaim.* Minsk: Junactva [Караткевіч Уладзімір. 1981. *Каласы пад сярпом тваім.* Мінск: Юнацтва].

Karatkevič Uladzimir. 1988. *Nel′ha zabyc′.* U: Uladzimir Karatkevič. *Zbor tvoraŭ: u 8 t.* T. 3. Minsk: Mastackaja litaratura. [Караткевіч Уладзімір. 1988. *Нельга забыць.* У: Уладзімір Караткевіч. *Збор твораў: у 8 т.* Т. 3. Мінск: Мастацкая літаратура. 5–335].

Karatkevič Uladzimir. 1990. *Kastus′ Kalinoŭski. Smerc′ i neŭmiručasc′.* U: Uladzimir Karatkevič. *Zbor tvoraŭ: u 8 t.* T. 8. Minsk: Mastackaja litaratura. 5–97 [Караткевіч Уладзімір. 1990. *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць.* У: Уладзімір Караткевіч. *Збор твораў: у 8 т.* Т. 8. Мінск: Мастацкая літаратура. 5–97].

Klimkovič Mixas′. *Kastus′ Kalinoŭski.* U: Mixas′ Klimkovič. *Zbor tvoraŭ: u 2 t.* T. 2. Minsk: Dzjaržvyd BSSR, 1959. 24–52 [Клімковіч Міхась. *Кастусь Каліноўскі.* У: Міхась Клімковіч. *Збор твораў: у 2 т.* Т. 2. Мінск: Дзяржвыд БССР. 24–52].

Korbut Viktar. 2023. *Litoŭcy i litoŭska-belaruskija adnosiny na staronkax hazet "Naša Dolja" i "Naša Niva" ŭ 1906–1907 hh.* "Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej" 16: 41–67 [Корбут Віктар. 2023. *Літоўцы і літоўска-беларускія адносіны на старонках газет "Наша Доля" і "Наша Нива" ў 1906–1907 гг.* „Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej" 16: 41–67].

Kuljašoŭ Arkadz′. 2003. *Xamucius.* U: Arkadz′ Kuljašoŭ. *Darohi: Veršy, paèmy.* Minsk: Mastackaja litaratura. 179–302 [Куляшоў Аркадзь. 2003. *Хамуціус.* У: Аркадзь Куляшоў. *Дарогі: Вершы, паэмы.* Мінск: Мастацкая літаратура. 179–302].

Leerssen Joep. 2007. *Imagology: History and method.* In: Manfred Beller, Joep Leerssen (eds.). *Imagology: The cultural construction and literary representation of national characters. A critical survey.* Amsterdam: Rodopi. 17–32.

Leerssen Joep. 2016. *Imagology: On using ethnicity to make sense of the world.* „Iberical, Revue d'études ibériques et ibéro-américaines" 10: 13–31.

Leerssen Joep. 2022. *Enmity, Identity, Discourse: Imagology and the State.* У: Katharina Edtstadler, Sandra Folie, Gianna Zocco (eds.). *New perspectives on imagology.* Leiden: Brill. 49–69.

Lobač Uladzimir, Vnukovič Juras′. 2011. *Vobraz litoŭcaŭ u belaruskaj narodnaj kul′tury.* U: Alesja Korsak (rèd.). *Belaruskae Padzvinne: vopyt, metodyka i vyniki paljavyx i miždyscyplinarnyx dasledavannjaŭ: u 2 častkax.* Č. 2. Navapolack: PDU. 167-178 [Лобач Уладзімір, Внуковіч Юрась. 2011. *Вобраз літоўцаў у беларускай народнай культуры.* У: Алеся Корсак (рэд.). *Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: у 2 частках.* Ч. 2. Наваполацк: ПДУ. 167–178].

Makarèvič Ales′. 2022. *Asablivasci mastackaha svetu trahedyi U. Karatkeviča "Kastus′ Kalinoŭski (Smerc′ i neŭmiručasc′)" jak mastackaj versii histaryčnyx faktaŭ.* "Acta Albaruthenica" 22: 97–122 [Макарэвіч Алесь. 2022. *Асаблівасці мастацкага свету трагедыі У. Караткевіча "Кастусь Каліноўскі (Смерць і неўміручасць)" як мастацкай версіі гістарычных фактаў.* „Acta Albaruthenica" 22: 97–122.

Mašara Mixas′. 1934. *S′merc′ Kastusja Kalinoŭskaha.* Vil′nja: Vydan′ne St. Hljakoŭskaha i Jaz. Najdzjuka [Машара Міхась. 1934. *Сьмерць Кастуся Каліноўскага.* Вільня: Выданьне Ст. Глякоўскага і Яз. Найдзюка].

Mečkovskaja Nina. 2002. *Nacional'no-kul'turnye oppozicii v mental'nosti belorusov (na materiale belorusskix paremij i frazeologizmov s ètnolingvonimami i toponimami).* U: Galina Neščimenko (rèd.). *Vstreči ètničeskix kul'tur v zerkale jazyka v sopostavitel'nom lingvokul'turnom aspekte.* Moskva: Nauka. 215–231 [Мечковская Нина. 2002. *Национально-культурные оппозиции в ментальности белорусов (на материале белорусских паремий и фразеологизмов с этнолингвонимами и топонимами).* У: Галина Нещименко (ред.). *Встречи этнических культур в зеркале языка в сопоставительном лингвокультурном аспекте.* Москва: Наука. 215–231].

Mel′nikava Anžèla. 2016. *Nacyjanal′na-svetapohljadnyja kaardynaty belaruskaj litaratury peršaj trèci XX stahoddzja.* Homel′: HDU imja F. Skaryny [Мельнікава Анжэла. 2016. *Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя.* Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны].

Meltzer Francoise. 2001. *For Fear of the Fire: Joan of Arc and the Limits of Subjectivity.* Chicago: The University of Chicago Press.

Mirovič Eŭscihnej. 1957. *Kastus′ Kalinoŭski.* U: Eŭscihnej Mirovič. *P′esy.* Minsk: Dzjaržaŭnae vydavectva BSSR, 1957. 3–68 [Міровіч Еўсцігней. 1957. *Кастусь Каліноўскі.* У: Еўсцігней Міровіч. *П′есы.* Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР. 3–68].

Nikol′ski Nikalaj, Dudkoŭ Dzjanis, Ločmel′ Iosif (rèd.). 1940. *Dakumenty i matèryjaly pa historyi Belarusi.* T. 2: *(1772–1903 hh.).* Minsk: Vydavectva AN BSSR [Нікольскі Нікалай, Дудкоў Дзяніс, Лочмель Іосіф (рэд.). 1940. *Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі.* Т. 2. *(1772–1903 гг.).* Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Sin′kova Ljudmila. 2015. *Komiks: z historyi žanru i jaho funkcyjanavannja na staronkax belaruskaha peryjadyčnaha druku.* U: Sergej Dubovik (rèd.). *Vizual'no-semantičeskie sredstva sovremennoj mediaindustrii: materialy Respublikanskoj naučno-praktičeskoj konferencii. Minsk, 20–21 marta 2015 g.* Minsk: Izdatel'skij centr BGU. 154–158 [Сінькова Людміла. 2015. *Комікс: з гісторыі жанру і яго функцыянавання на старонках беларускага перыядычнага друку.* У: Сергей Дубовик (ред). *Визуально-семантические средства современной медиаиндустрии: материалы Республиканской научно-практической конференции. Минск, 20–21 марта 2015 г.* Минск: Издательский центр БГУ. 154–158].

Toporov Vladimir. 1990. *Obraz "soseda" v stanovlenii ètničeskogo samosoznanija (russko-litovskaja perspektiva).* U: Gennadij Litavrin (rèd.). *Slavjane i ix sosedi. Ètnopsixologičeskij stereotip v srednie veka.* Moskva: Institut slavjanovedenija i balkanistiki AN SSSR. 4–14 [Топоров Владимир. 1990. *Образ "соседа" в становлении этнического самосознания (русско-литовская перспектива).* У: Геннадий Литаврин (ред.). *Славяне и их соседи. Этно-психологический стереотип в средние века.* Москва: Институт славяноведения и балканистики АН СССР. 4–14].

Vnukovič Juras′. 2010. *Litoŭcy Belarusi. Ètnalahičnae dasledavanne.* Minsk: Belaruskaja navuka [Внуковіч Юрась. 2010. *Літоўцы Беларусі. Этналагічнае даследаванне.* Мінск: Беларуская навука].

Vol′ny Anatol′. 1926. *Kastus′ Kalunoŭski.* U: Anatol′ Vol′ny. *Čornakudraja radas′c′.* Mensk: Vydan′ne CB "Maladnjaka". 3–20 [Вольны Анатоль. 1926. *Кастусь Калиноўскі.* У: Анатоль Вольны. *Чорнакудрая радасьць.* Менск: Выданьне ЦБ "Маладняка". 3–20].

Volynec Tat'jana. 2009. *Ètnostereotipy i ix otraženie v jazykovom soznanii belorusov.* U: Ivan Rovdo (rèd.). *Russkij jazyk: sistema i funkcionirovanie (k 70-letiju filologičeskogo fakul'teta): sb. materialov IV Meždunar. nauč. konf., g. Minsk, 5–6 maja 2009 g.: v 2 č.* Č. 1. Minsk: RIVŠ. 16–24 [Волынец Татьяна. 2009. *Этностереотипы*

*и их отражение в языковом сознании белорусов.* У: Иван Ровдо (ред.). *Русский язык: система и функционирование (к 70-летию филологического факультета): сб. материалов IV Междунар. науч. конф., г. Минск, 5–6 мая 2009 г.: в 2 ч.* Ч. 1. Минск: РИВШ. 16–24].

Xaroška Hanna. 2006. *"Xamucius" Arkadzja Kuljašova – vjaršynnae dasjahnenne dramatyčnaha èpasu.* U: Arkadij Ruseckij (rèd.). *Učenye zapiski UO "Vitebskij gosudarstvennyj universitet im. P. M. Mašerova"*. T. 5. 111–132 [Харошка Ганна. 2006. *"Хамуціус" Аркадзя Куляшова – вяршыннае дасягненне драматычнага эпасу.* У: Аркадий Русецкий (ред.). *Ученые записки УО "Витебский государственный университет им. П. М. Машерова"*. Т. 5. 111–132].

Žemaitytė-Narkevičienė Ona. 2000. *Vyskupas Motiejus Valančius ir jo kariai.* Kaunas: Naujasis amžius.

**STRESZCZENIE**: W pracach U. Karatkiewicza dotyczących powstania z lat 1863–1864 obraz Litwina nabiera nowych cech, które wcześniej nie były charakterystyczne dla literatury białoruskiej – jest on romantyzowany i egzotyzowany. Jako hetero-obraz kontrastuje on z auto-obrazem Białorusina nie jako „zły", „niegodziwy" lub „niewłaściwy", ale jako „dziwny", „niezwykły" i „niezwyczajny". Zmienia się również jego status społeczny: obecnie często kojarzony jest z heroicznymi postaciami księży katolickich. Tę nową tradycję kontynuują niektórzy inni autorzy drugiej połowy XX w., tacy jak A. Kulaszou i A. Jakimowicz.

**SŁOWA KLUCZOWE**: etnotyp Litwina, imagologia, egzotyzacja, postać księdza katolickiego, literatura białoruska.

**АНАТАЦЫЯ**: У творах У. Караткевіча пра паўстанне 1863–1864 гадоў вобраз літоўца набывае новыя, раней не характэрныя для беларускай літаратуры, рысы – рамантызуецца і экзатызуецца. Як гетэравобраз ён супрацьпастаўляецца аўтавобразу беларуса не як "дрэнны", "злы", "няправільны", а як "дзіўны", "незвычайны", "нязвыклы". Змяняецца і яго сацыяльны статус, цяпер ён часта ўвязваецца з гераізаванымі постацямі каталіцкіх святароў. Гэтай новай традыцыі прытрымліваюцца і некаторыя іншыя аўтары другой паловы XX ст. – А. Куляшоў і А. Якімовіч.

**КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ**: этнатып літоўца, імагалогія, экзатызацыя, вобраз каталіцкага святара, беларуская літаратура.